БАЖ – гэта
пра медыя,
baj.media

ЭЛЕКТРОННЫ БЮЛЕТЭНЬ

# СМІ
## Ў БЕЛАРУСІ

№2 (83)
2026



Журналістка «Белсат» Кацярына Андрэева (Бахвалава). Сустрэча палітычных зняволеных у Вільні. 19 сакавіка 2026 года. Фота: «Белсат»

# СМІ Ў БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ-САКАВІКУ 2026 ГОДА. АГЛЯД

**На пачатак 2026 году ў Беларусі заставаліся 28 зняволеных супрацоўнікаў медыя. Пасля візіту ў Мінск 19 сакавіка спецпрадстаўніка прэзідэнта ЗША Джона Коўла беларускія ўлады паведамілі пра вызваленне 250 палітзняволеных.** Пятнаццаць чалавек у той жа дзень былі вывезеныя у Літву, астатнія засталіся ў Беларусі. Сярод вывезеных – журналістка **Кацярына Бахвалава (Андрэева)** і блогер **Эдуард Пальчыс.** Таксама выйшлі з турмы супрацоўнікі медыя **Алег Супрунюк, Аляксандр Марчанка, Валерыя Касцюгова** і **Антон Казельскі.**

Між тым **працягвалася вынясенне жорсткіх палітычна матывава-ных прысудаў іншым журналістам – за тры месяцы былі асуджаны 6 чалавек.** Працягваўся сістэматычны завочны крымінальны пераслед беларускіх медыясупрацоўнікаў у замежжы; ён закрануў і нядаўна вызваленых.

**Узнікла новая форма пераследу** – у некаторых незалежных журналістаў, вывезеных за мяжу з дакументамі, былі ануляваныя пашпарты Рэспублікі Беларусь.

Улады працягвалі выкарыстоўваць «антыэкстрэмісцкае» заканадаўства для абмежаванняў свабоды выказвання. Шматлікія публікацыі, як беларускіх, так і замежных крыніц (напрыклад, кантэнт сайта **рускай службы BBC) прызнаваліся «экстрэмісцкімі матэрыяламі»**.

**У Беларусі быў ухвалены законапраект, які дазваляе парушэнне аўтарскіх правоў дзяржаўнымі тэлеканаламі** – выкарыстанне музыкі без згоды праваўладальнікаў пры стварэнні пэўных перадач.

## Крымінальны пераслед. Затрыманні ў Беларусі

У Брэсцкім абласным судзе 26 лютага быў агучаны прысуд былым кіраўнікам баранавіцкага навінавага партала BAR24 (раней – незалежная газета “Intex- Press”) **Уладзіміру Янукевічу і Андрэю Пакаленку.** Па абвінавачванні ў «здрадзе дзяржаве» (артыкул 356 Крымінальнага кодэксу) суд прызначыў Янукевічу **14 гадоў пазбаўлення волі** і 135 тысячаў рублёў штрафу, Пакаленку — **12 гадоў** і 45 тысячаў рублёў штрафу. Таксама ёсць інфармацыя пра вялізнае агульнае спагнанне ў памеры каля 200 тысячаў рублёў. Сутнасць абвінавачвання невядомая.

4 сакавіка Мінскі гарадскі суд асудзіў музыку і радыёвядоўцу **Алега Хаменку** паводле артыкула 361–4 Крымінальнага кодэкса (садзейнічанне экстрэмісцкай дзейнасці). У віну артысту паставілі сталую супрацу з рэдакцыяй «Беларускае Радыё Рацыя», што базуецца ў Польшчы, і прыгаварылі да трох гадоў пазбаўлення волі. ;

6 сакавіка быў вынесены прысуд журналісту **Паўлу Дабравольскаму**, абвінавачанаму ў «здрадзе дзяржаве»: паводле артыкула 356 Крымінальнага кодэкса ён атрымаў 9 гадоў пазбаўлення волі з адбыццём у калоніі строгага рэжыму. Па звестках БАЖ, абвінавачанне было звязанае з журналісцкімі публікацыямі Дабравольскага. Раней ён працаваў як на беларускія, так і на замежныя СМІ, у тым ліку на ўкраінскі часопіс NV.ua. Дабравольскі быў затрыманы ў Мінску 22 студзеня 2025 года — праз некалькі месяцаў пасля вяртання на радзіму з- за мяжы.

Журналістку **Ціну Палынскую** і яе дачку **Маргарыту Рабіновіч** асудзілі да двух гадоў пазбаўлення волі кожную паводле артыкула 361–1 Крымінальнага кодэксу (стварэнне экстрэмісцкага фарміравання або ўдзел у ім). Яны былі затрыманыя ў траўні 2025 года, знаходзіліся пад вартай. За гэты час памёр муж Палынскай пісьменнік **Алесь Палынскі**. Паведамлялася, што справа маці і дачкі можа быць звязана з прызнаннем «Беларускай аналітычнай майстэрні» прафесара Андрэя Вардамацкага «экстрэмісцкім фарміраваннем». Гэта арганізацыя праводзіла сацыялагічныя апытанні сярод беларускіх грамадзян.


Вольга Харламава, фота «Еўрарадыё»

У сакавіку стала вядома, што ў чэрвені 2025 года ў сувязі з абвінавачаннем у «здрадзе дзяржаве» (артыкул 356 Кры-мінальнага кодэкса) была затрыманая палітолаг і медыяаналітык **Вольга Харламава**. Да арышту яна каментавала для розных беларускіх і замежных СМІ падзеі ў Беларусі і свеце, раней была аналітыкам праекта Media IQ. Харламавай пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 7 да 15 гадоў.

**Працягваўся завочны крымінальны пераслед медыясупрацоўнікаў, якія знаходзяцца у эміграцыі.** З боку сілавых структур адбываўся ціск на іх родных. У прыватнасці, журналіст расследніцкага выдання «Бюро Медыя» **Аляксей Карпека** даведаўся пра абвінавачванне паводле артыкула 361–1 Крымінальнага Кодэкса (удзел у экстрэмісцкім фарміраванні), блогерка і тэлевядоўца **Кацярына Ваданосава**, якая асвятляе гістарычную тэматыку, стала фігуранткай справы, распачатай паводле артыкула 130–1 Крымінальнага кодэкса («Рэабілітацыя нацызму, здзейсненая групай асоб па папярэдняй змове з выкарыстаннем глабальнай камп'ютарнай сеткі інтэрнэт»).

БЮРО




Мікола Дзядок у Вільні, Фота: spring96.org

**Палітзняволеныя, вызваленыя ў выніку дыпламатычных дамоўленасцяў, наноў станавіліся аб'ектамі крымінальнага пераследу ў Беларусі.** Так, [была ўзбуджана]() новая крымінальная справа ў адносінах да блогера **Міколы Дзядка** (былы журналіст незалежнай газеты «Новы Час», актывіст анархісцскага руху).

**Улады перайшлі ад арышту нерухомай маёмасці журналістаў у Беларусіда яе рэалізацыі праз аўкцыён для кампенсацыі накладзеных у выніку завочных судоў вялізарных штрафаў.** Пра гэта, у прыватнасці, [даведаўся]() гродзенскі журналіст **Уладзімір Хільмановіч**, асуджаны за «экстрэмізм», чые кватэра і дом у вёсцы былі выстаўленыя на продаж.




Скрыншот аб'явы аб продажы кватэры журналіста Уладзіміра Хільмановіча

**Новай формай пераследу вызваленых палітвязняў, якіх вывезлі за мяжу з асабістымі дакументамі, стала [ануляванне іх пашпартоў]() Рэспублікі Беларусь.** Напрыканцы сакавіка журналіст **Вячаслаў Лазараў**, блогеры **Дзмітрый Казлоў** і **Эдуард Пальчыс**, якія ў розны час выйшлі на волю дзякуючы садзеянню ЗША, даведаліся, што беларускія ўлады анулявалі іх пашпарты.

# Цэнзура

**Улады працягвалі абмяжоўваць доступ да крыніц альтэрнатыўнай інфармацыі.** Шматлікія публікацыі як беларускіх, так і замежных медыя прызнаваліся «экстрэмісцкімі».

19 сакавіка **[была створаная Мінская гарадская камісія]()** па правядзенню ацэнкі сімволікі, атрыбутыкі і інфармацыйнай прадукцыі (стварэнне такой камісіі прадугледжвалася пастановай Савета Міністраў ад 2021 года, але да гэтага ў сталіцы дзейнічалі толькі рэспубліканская і Мінская абласная камісіі).

**У Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў**, разам з многімі іншымі, на падставе судовых рашэнняў былі ўключаныя кантэнт **рускай службы BBC, «Новой газеты Европа», старонкі «Радыё Свабода | Беларусь» у Threads**. З гэтай нагоды прэс-служба BBC распаўсюдзіла заяву, у якой падкрэсліваецца, што яе супрацоўнікі *«глыбока занепакоеныя тымі наступствамі, якія ўключэнне Рускай службы BBC ў спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў можа мець для сотняў тысяч жыхароў Беларусі, якія кожны тыдзень звяртаюцца да BBC у пошуках так неабходнай ім дакладнай і бесстаронняй інфармацыі»*.



Максім Шуканаў.
Скрыншот: UnionBell/Youtube

У Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці, быў уключаны відэаблогер **Максім Шуканаў**, які адбывае чатырохгадовы тэрмін пазбаўлення волі.

**У Дзень Волі 25 сакавіка шэраг беларускіх сайтаў – у тым ліку незалежных медыя «Наша Ніва», Reform.news і "Медиазона. Беларусь" – трапілі пад DDOS-атакі.** Хто стаіць за імі, дакладна не вядома, аднак зранку 25 сакавіка гэтыя атакі ўхвалілі аўтары прапагандысцкіх тэлеграм-каналаў, прыбліжаных да беларускіх сілавікоў. *«Добрыя хакеры павіншавалі беглых экстрэмістаў са святам»*, — напісалі ў адным з іх і дадалі, што «ў праграме адпраўка на адпачынак некалькіх» рэсурсаў.



pexels.com

# Дзяржаўная інфармацыйная палітыка

Дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі працягвалі ажыццяўляць прапагандысцкую дзейнасць.

23 лютага **пачаў вяшчанне тэлеканал «ВоенТВ»**, які быў уключаны ў пакет рэспубліканскіх каналаў. Па словах першага намесніка гендырэк-

тара тэлекампаніі «ВоенТВ» Канстанціна Гагарына, новы тэлеканал будзе *«бесперапынна расказваць пра дзяржаўную палітыку ў галіне абароны»*, бо *«калі не ўзброена свядомасць народа, то прайграеш любое супрацьстаянне»*.



Скрыншот сайта «ВоенТВ»

Пасля таго як у Расіі перайшлі да чарговага этапу Telegram і YouTube (з 10 лютага), некаторыя беларускія прапагандысцкія СМІ, у прыватнасці, «SB.BY Беларусь сегодня», **пачалі рэкламавацца ў расійскім месенджары Max**.

Праектам закона, прынятым Палатай прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь у першым чытанні, прадугледжваецца **свабоднае выкарыстанне музыкі без згоды аўтараў** ці праваўладальнікаў, пры ўмове належных абавязковых выплат, **пры стварэнні пэўных тэлеперадач дзяржаўнымі каналамі,** якія ўваходзяць у абавязковы агульнадаступны пакет. Дазвол на парушэнне аўтарскіх правоў быў матываваны спецыфікай тэлевізійнай вытворчасці, што патрабуе аператыўнасці.


Рыгор Азаронак. Фота sb.by

У лютым папулярная сацыяльная сетка **TikTok выдаліла акаўнт беларускага прапагандыста Рыгора Азаронка «Azarenok_napryamuyu»**, які меў больш за 12 тысяч падпісчыкаў. Прычынай блакіроўкі ў выпадках такога кшталту звычайна становіцца парушэнне правіл супольнасці, у прыватнасці — распальванне нянавісці або распаўсюд дэзінфармацыі.


Фота: Towfiqu barbhuiya / pexels.com

**БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ**

baj.media

Змест гэтага электроннага выдання абаронены нормамі Аўтарскага права. Спасылка на «Беларуская асацыяцыя журналістаў» пры выкарыстанні матэрыялаў ЭЛЕКТРОННАГА БЮЛЕТЭНЯ «СМІ Ў БЕЛАРУСІ» з’яўляецца абавязковай.

Кантакт:
Андрэй
Бастунец

E-mail: *office@baj.media*
Web: *https://baj.media/be*